**Культурна-масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК "Лунінецкая РЦБС" у верасні**

Прайшлі мерапрыемствы, прысвечаныя **Дню ведаў.**

**2 верасня. ЦДБ.** Прайшла патрыятычная гадзіна для вучняў 4 класа СШ №1 «Нам есть чем гордиться, нам есть что беречь!». Школьнікі даведаліся для чаго патрэбна бібліятэка, пазнаёміліся з правіламі паводзін у бібліятэцы. У канцы мерапрыемства граматамі былі ўзнагароджаны лепшыя чытачы класа.

**4 верасня** ў **Рэдзігераўскай с.б.** Для першакласнікаў адбыўся урок-вандроўка "Удивительные книжные тайны", у **Бастынскай с.б.** – урок ведаў «Без навукі, як без рук».

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня бібліятэк.**

З **9 па 15 верасня** ў бібліятэках праходзіў Тыдзень бібліятэк "Библиотека – мудрый дом души", прысвечаная **Дню бібліятэк** Рэспублікі Беларусь.

**10 верасня. ЦБ.** Пачалася нядзеля з Дня самакіравання ў цэнтральнай раённай бібліятэцы. Паспрабаваць сябе ў ролі бібліятэкара змаглі вучні СШ №1. Асноўная мэта мерапрыемства – паказаць, што прафесія бібліятэкара творчая, патрабуе шырокага кругагляду, разнастайных ведаў і камунікатыўных навыкаў. *(Лунінецкія навіны. 2024. 13 верасня. С.8)*

У гэты ж дзень у бібліятэцы прайшоў Дзень адчыненых дзвярэй. У бібліятэку прыйшлі вучні 7 класа СШ №1. Бібліятэкар правяла экскурсію па бібліятэцы, усе жадаючыя запісаліся ў бібліятэку.

Таксама ў бібліятэцы адбылося ўзнагароджанне самых актыўных чытачоў. Імі сталі Ярмушэвіч Валянціна Міхайлаўна і Высоцкая Тамара Сяргееўна. Ім былі ўручаны дыпломы і памятныя сувеніры

**11 верасня. ЦБ і ЦДБ.** На пляцоўцы каля ТЦ "СИТИ Маяк" супрацоўнікі бібліятэк правялі акцыю "Бібліятэчны бульвар". Бібліятэкары раздавалі прахожым інфармацыю-закладкі і візітоўкі з інфармацыяй аб дзейнасці бібліятэк. Для кнігалюбаў прайшла акцыя-буккросінг. Самыя маленькія наведвальнікі пляцоўкі адказвалі на пытанні казачнай віктарыны, знаёміліся з выставай навінак літаратуры і выставай лялек Цільда. Кожны жадаючы змог сфатаграфавацца з любімымі героямі мультфільмаў і запісацца ў бібліятэку.

**12 верасня. ЦБ.** Для бібліятэкараў ДУК "Лунінецкая РЦБС" адбыўся Дзень прафесійных зносін «Библиотека – территория чтения, общения и творчества». Напачатку прайшло ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае Дню бібліятэк. Ганаровыя ўзнагароды атрымалі лепшыя супрацоўнікі ЦБС. Далей у ходзе мерапрыемства бібліятэкары дзяліліся вопытам работы, давалі практычныя парады па ўсіх напрамках дзейнасці.

**13 верасня. ЦБ.** Прайшло пасяджанне народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Литературная провинция», прысвечанае Дню бібліятэк "Храм мудрости: завтра и вчера".

Святочныя мерапрыемствы прайшлі і ў сельскіх бібліятэках. Так, **11 верасня** ў **Сінкевіцкай с.б.** адбыўся беніфіс чытача "Я пришёл в библиотеку". Для першакласнікаў бібліятэкар правяла азнакамляльную экскурсію па

бібліятэцы, пазнаёміла з растаноўкай кніг. Напрыканцы мерапрыемства адбылося прысвячэнне ў чытачы першакласнікаў. Таксама для школьнікаў у бібліятэцы прайшла прэзентацыя новых паступленняў "Навінкі з кніжнага кошыка". **13 верасня** ў **Рэдзігераўскай с.б**. прайшла экскурсія «С книгой назначена встреча». Школьнікі пазнаёміліся з кніжнымі выставамі і наведалі міні-музей этнаграфіі і сялянскага побыту "Прылады даўніны". У **Бродніцкай сельскай бібліятэцы-клубе** прайшла літаратурная вандроўка "Чудесная страна Библиотека". У **Багданаўскай с.б.** правялі паэтычны лабірынт «Библиотека – чудесная страна».

Свой 50-гадовы юбілей адзначыла **Дрэбская сельская бібліятэка-клуб**. Жыхароў вёскі запрасілі на Дзень адчыненых дзвярэй "С днём рождения, библиотека!" Усе жадаючыя змаглі прыняць удзел у акцыі "Подари книгу библиотеке". А **Лабчанская сельская бібліятэка** адсвяткавала 85-гадовы юбілей. Бібліятэкар пазнаёміла чытачоў з гісторыяй бібліятэкі, выказала падзяку лепшым чытачам.

Прайшлі мерапрыемствы да **Дня народнага адзінства**.

Ва ўсіх бібліятэках былі аформлены кніжныя выставы. Так, у цэнтральнай раённай дзіцячай бібліятэцы адбылася адкрыццё кніжнай выставы «В единстве народа – сила страны», у Бродніцкай сельскай бібліятэцы-клубе - «Пока мы едины – мы непобедимы», у Лунінскай с.б. - «Наше будущее в единстве», у Любанскай с.б. – «День народного единства» і інш.

**17 верасня. ЦБ.** У фае гарадскога Дома культуры, супрацоўнікі бібліятэкі прадставілі для ўдзельнікаў урачыстага мерапрыемства, разгорнутую книжную выставу "Беларусь – страна единства".

У чытальнай зале **цэнтральнай раённай бібліятэкі** прайшла гісторыка-краязнаўчая гадзіна "Когда мы едины, то непобедимы!», у якой прынялі ўдзел вучні 9 «Б» класа СШ №1. У ходзе мерапрыемства прысутныя адказвалі на пытанні віктарыны "Мая Беларусь" і паглядзелі відыяролік "День народного единства: что заложено в этом празднике?"

Прайшлі мерапрыемствы і ў сельскіх бібліятэках. Так, у **Рэдзігераўскай с.б.** прайшла інфармацыйная гадзіна "О родной земле с любовью", у **Палескай с.б.** – пазнавальная гадзіна "Мир и единство – сила народа", у **Дрэбскай сельскай бібліятэцы-клубе** – інфармацыйная гадзіна «Беларусь – это мы», у **Межлескай с.б.** – анлайн-вандроўка "В единстве – наше будущее".

**24 верасня. ЦБ.** У актавай зале прайшла прэзентацыя кнігі "Жизнь продолжается…" , прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аўтар кнігі доктар філасофскіх навук Валерый Паўлавіч Старжынскі. У кнізе адлюстраваны лёс ураджэнкі Палесся Лідзіі Рыгораўны Пракаповіч (Бакуновіч), якая падчас Вялікай Айчыннай вайны перажыла жахі фашысцкай акупацыі. На мерапрыемстве прысутнічалі дачка Л.Р. Пракаповіч Ніна Іванаўна Воцякова, краязнаўца Таццяна Васільеўна Канапацкая, старшыня раённага аб'яднання прафсаюзаў Ігар Іванавіч Гапон, малалетнііі вязень канцлагера Іван Рудовіч, кіраўнік па ваенна-патрыятычнаму выхаванню СШ №2 Мікалай Іванавіч Вячорка, вучні СШ №2, СШ №3 і гімназіі

імя Н.П.Анцукевіча. Ніна Іванаўна перадала ў дар бібліятэцы некалькі экземпляраў кніг.

**25 верасня. ЦБ**. Для ўдзельнікаў арт-студыі “В фокусе палитры”, у якой займаюцца дзеці з абмежаванымі магчымасцямі здароўя, была арганізавана экскурсія-пленэр. Дзеці пабывалі на каняферме ў аграгарадку Кажан-Гарадок. Яны з цікавасцю паназіралі за жывёламі, кармілі іх і каталіся на возе. Завяршальнай кропкай экскурсіі быў пленэр. Мальберты для дзяцей былі закуплены за сродкі, атрыманыя на дабрачынным аўкцыёне, які штогод праводзіцца 1 чэрвеня ў Дзень абароны дзяцей. Заняткі правяла валанцёр Беларускага таварыства інвалідаў А.Ф.Пясоцкая.

**26 верасня. ЦДБ.** Для вучняў 4 “Б” класа СШ №1 і выхаванцаў адзялення дзённага знаходжання для інвалідаў ТЦСАН у чытальнай зале прайшла сустрэча з мясцовай паэткай, удзельніцай народнай літаратурна-паэтычнай студыі А.А. Пратасавіцкай.